АДЗЕЛ ПА АДУКАЦЫІ
ПРУЖАНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"ДЗІЦЯЧЫ САД №5 Г.ПРУЖАНЫ"

"Дыдактычная гульня як сродак
фарміравання звязнага маўлення
ў здяцей дашкольнага ўзросту"
19.11.2024

***"Свойскія жывёлы".***

Мэта:
- фарміравацьуменне называць прадметынавакольнага асяродзя, іх якасці, дзеянні;
- развіваць уменне выкарыстоўваць у маўленні словы, якія абазначаюць відавое паняцце – свойскія жывелы; развіваць уменне утвараць формы 3 асобы адзіночнага ліку дзеяслову; развівацьуменне ўтварацьсловы з памяншальна-ласкальным суфіксам; развіваць уменне правільнавымаўляцьбеларускія гукі (г), (ў), (р); развіваць гаворку, увагу, мысленне
- выхоўваць устойлівую цікавасцы сапраўдныя адносіныда беларускай мовы, асновы нацыянальнага светапогляду.

Арганізацыйны момант

Сонейка ўстала,
Раніца настала.
Мы ўсе сабраліся,
За рукі ўзяліся
І павіталіся.

- Добрай раніцы. Сення наша хата гасцямі багата.
- Добрай раніцы мы скажам, вельмі рады мы гасцям.

Сюрпрызны момант.

- Сёння я атрамала ліст ад Лесавічка. Лесавічок – гэта захавальнік лясных таямніц і сакрэтаў.

"Добрай раніцы, мае паважаныя сябры! Я жыву ў лесе. У мяне тут шмат сяброў – дзікіх жывёл. Я пра іх нямала ведаю. Да вас я напісаў пісьмо, каб давадацца пра свойскіх жывёл."

- Хто такія свойскія жывёлы?

Свойскія жывёлы жывуць каля або разам з чалавекам. Чалавек клапоціцца пра іх.

Асноўная частка.

<u>Д/г. “Адгадай чыя шорстка?”</u>

Дзецям неабходна здагадацца, хто з жывёл схаваўся па колеру шорсткі.

<u>Д/г. “Знайздзі здіцяня”.</u>

У бабулі па падворку разбегліся здіцяняты. Мамы не могуць іх знайсці. Трэба знайсці пару маці-дзіця.

<u>Гульня з мячом “Які? Якая? Якое?”</u>

Карова вялікая, а цяля (якое?) …
Каза вялікая, а казляня (якое?) …
Трус вялікі, а трусік (які?) …
Сабака вялікі, а шчаня (якое?) …
Жарабя малое, а конь (які?) …

<u>Рухомая гульня “пастух і каровы”.</u>

Выйшлі ўсе каровы на лужок,
Каб паскубсці мурашок.
Тут пастух: “Ту-ру-ру-ру”
А каровы ўслед яму:
-Му-му-му, малака каму?
Усе каровы маюць рожкі,
Хочуць пабадацца трошки.
Тут пастух: “Ту-ру-ру-ру”
А каровы ўслед яму:
-Му-му-му, малака каму?

(Дзеці ходзяцьза выхавальнікам, імітуючы, як каровы пасуцца, бадаюцца)

<u>Сустрэча з кошкай и кацянятамі.</u>

- Хто гэта нас чакае?

Давайце разгледзім кошку і кацяня.
У кошкі вусы, а ў кацяня…
У кошкі вочы, а ў кацяня …

<u>Гульнёвае практыкаванне “Як хто размаўляе?”</u>

- Дзеці, заплюшчыце вочы і паслухайце. Каго вы пачулі? Якія гукі вы пачулі?

<u>Д/г. “Пакармі жывёлу”.</u>

Нашы жывёлы прагаладаліся , трэба іх накарміць. Перад дзяцьмі ляжаць малюнкі свойскіх жывёл. Падбраць, што ядзяць жывёлы.

Карова – сена, трава.
Конь – сена, трава.
Кот – рыба, малако, сасіска.

Коза – капуста, морква, трава, сена.
Свіння – бульба.
Сабака – сасіска, костачка.
Авечка – трава, сена.
Трус – морква, капуста, трава, сена.

Падвядзенне вынікаў.

- Дзеці, пра каго мы размаўлялі на занятку?
- Як называюцца ўсе гэтыя жывёлы адным словам?
- Што мы рабілі на занятку?

- Ой, зусім забылася, Лесавічок даслаў вам пасылку з ляснымі падарункамі: шышкі сасновыя, яловыя. Будзем з вамі рабіць з із падзелкі.

Выхавальнік дашкольнай
адукацыі Г.М.Кавальчук